12.30 «Церковь и мир»
13.00, 14.00, 16.00, 17.00, 18.00, 20.00, 20.55, 22.05, 23.00, 23.55 «Союз онлайн»
14.45 «Разговор на «ты»
15.00 «Душевная вечеря»
15.30 «Доброе слово - день»
16.05 «Церковь и общество»
18.05 «Лаврские встречи со священником Анатолием Першиным»
18.30 «Духовные размышления»
18.45 «Солдатский вопрос»
20.05 «События недели»
21.30 «Доброе слово - вечер»
21.45 «Купелька»
22.10 «В студии - протоиерей Димитрий Смирнов»
23.30 «Беседы с Владыкой Павлом»

ТВ 1000 Русское кино

06.20, 18.20 Русская игра
08.10, 02.00 Благословите женщину



10.20, 04.20 Похороните меня за плинтусом
12.20 Бриллианты для диктатуры пролетариата СССР
14.10 Каникулы строгого режима
16.15 Мама
20.20 Я не вернусь
22.20 Если любишь - прости
00.20 Три девушки

РЕТРоТВ

06.00, 12.00, 18.00, 00.00 ТАСС уполномочен заявить
07.20, 13.10, 19.05 Утренняя почта
07.50 Маски в Одессе
08.15, 14.10, 20.05 Возвращение мушкетёров, или сокровища кардинала Мазарини
09.10 Песня года-84-1
10.25 Песня года-84-2
11.40 Маски в больнице 2
13.40 Маски в опере
15.05 Не отступать и не сдаваться
16.40 Рок
19.35 Маски грабят банк
21.00 Самоволка
22.45 Интер-поп-шоу
01.05 Сто лет комедии
02.35 Бледнолицый
03.00 Невезучие
04.30 Папаши

ВТВ

06.00, 04.00 «ДАЕШЬ МОЛОДЕЖЬ»
06.30 «СДАЕТСЯ! С РЕМОНТОМ»
07.30 «ЙОКО»
07.45 «СМЕШАРИКИ»
08.00 «МАШИНЫ СКАЗКИ»
08.30, 16.00 «ЕРАЛАШ»
09.00 «КТО КОГО НА КУХНЕ»
09.30, 03.30 «ЛОВИ МОМЕНТ»
10.00, 00.50 «ТУРБО МИКСЕР»
12.00 «УСПЕТЬ ЗА 24 ЧАСА»
13.00 «МАМОЧКИ»
15.00, 19.30 «УРАЛЬСКИЕ ПЕЛЬМЕНИ»
16.30, 23.30, 04.30 «6 КАДРОВ»
17.20 «ПАРАЛЛЕЛЬНЫЕ МИРЫ»
21.00 «НЕУДЕРЖИМЫЕ 2»
23.05 «СТУДЕНТЫ»
00.00 Европейский покерный турнир
05.30 «ДУРАКИ И ДОРОГИ»

RTVi

06.00, 12.00 «ИЗРАИЛЬ ЗА НЕДЕЛЮ»
07.00 М/ф
08.20 «ПОТРЯСАЮЩИЙ БЕРЕНДЕЕВ»
09.30, 00.00 «АМЕРИКАНСКИЙ ЛИКБЕЗ»
10.00, 01.00 «МАМА НАПРОКАТ»
13.00, 21.00 «КУКА»
15.00 «СТАМБУЛЬСКИЙ ТРАНЗИТ»
17.00, 23.00, 05.00 «ТАЙМ-КОД»
18.00 «НОВЫЙ ВЕК РУССКОГО ТЕАТРА»
19.00 «СЕЙЧАС В МИРЕ»
19.15 «ОСОБОЕ МНЕНИЕ»
20.00 «В НЬЮ-ЙОРКЕ С ВИКТОРОМ ТОПАЛЛЕРОМ»
00.30 «ДИАСПОРЫ МОСКВЫ»
03.00 «МОИ УНИВЕРСИТЕТЫ»

Animal Planet

06.00, 11.25 Крючок, верёвка и челюсти
06.25, 09.45 Пёс-ТВ
07.15 Долина панд
08.05, 18.30 Задержание
08.55, 19.20 Заклинатель змей: В поисках самой ядовитой гремучей змеи
10.35, 22.00 Очарование кобры
11.00, 22.30 Крокодилы-каннибалы
11.50 Ветеринар Бондай Бич
12.40, 01.00 Голубые Багамы
13.30, 02.00 Гебриды
14.20, 02.48 Другой Китай
15.10, 03.36 Анаконда
16.00, 04.24 Лев против гиены
16.50, 05.12 Фолклендские острова
17.40 Дикий дизайн
20.10, 20.35 Деревенские ветеринары
21.00 Обратно на рельсы
23.00 Эстафетная палочка
00.00 Страшнее кошки зверя нет

Sci-Fi

06.00, 06.45, 07.30, 13.50, 14.35, 15.20, 16.05 Библиотекари
08.15, 09.10 Убежище
10.05, 10.50, 11.35, 12.20 Звездные Врата
13.05 Верить
16.50, 17.40, 18.30, 19.20, 20.10 Всемогущие Джонсоны
21.00, 21.45, 22.30, 23.15, 00.00 Сверхъестественное
00.45, 01.30, 02.15, 03.00, 03.45 Древние
04.30, 05.15 Охотники За Привидениями

Белсат

07.00 Студыя «Белсат»
07.10 ПраСвет
07.50, 08.00, 10.55, 11.05 Прыгоды Цўкі
08.05, 08.20, 11.10, 11.25 Сцэны з жыцця цмокаў
08.35 Зона «Свабоды»
09.15 Маю права
09.35 Закапаная цывілізацыя
09.55 Два на два
10.25 Рэпартэр
11.40 Тры шалёных нулі
12.05 Гісторыя пад знакам Пагоні
12.15 Беларусы ў Польшчы
12.35 За крок ад прорвы
12.50, 00.25-01.20 Mad Men
13.40, 22.55 Страчаныя жыцці
14.20 Гвардыя
15.10 Пагроза «русского мира»
15.55 54 %
16.15 Людскія справы
16.50 Долгая счастливая жизнь
18.10 Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча
18.35 Чарнобыль
19.00 Эксперт
19.30 Данчык
20.15 Заўтра мы знікнем
21.10 Мілажаль
23.40 Таямніца Гайнрыха Гімлера

Женское имя	Нечеловеческий врач	Певец Тальков	Индийская длина	Репейник
Стих Пушкина	Клевета	Ъ	Финский город	Клич на свадьбе
Стих Есенина	Винни-...			

ЛИНЕЙНЫЕ КРОССВОРДЫ ОТ ВЛАДИМИРА ВАШУТЫ



Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ
Уласны карэспандэнт
«ГС» на Дзятлаўшчыне
Адрас: 231471, г. Дзятлава, а/я 31
Email: 375299518893@yandex.by

25 траўня 2016 года №22 (990)

ВАРОЖАСЦЬ

У аграгарадку Вакульчыцы ў гэты сакавіцкі дзень было ўсё адно як свята: людзям выдалі зарплату за студзень. Даяркі Люба Самасейка і Галя Анкушык, ідучы з дзённай дойкі, зазірнулі ў магазін, што стаяў на ўзгорку акурат пасярод аграгарадка.

— Мне трэба купіць цукерак, бо ў суботу дачка з зяцем унукаў прывязуць, — радасна сказала Люба.

— А мае былі ў мінулыя выхадныя, але цукерак і я куплю, бо сама люблю салодкае. А яшчэ ў магазіне ёсць кофтачка, на якую я даўно пазіраю, а купіць усё грошай не стае. Цяпер, калі ніхто не забраў, абавязкова куплю, — падзялілася сваімі планамі Галя.

Яны былі суседкамі, так бы мовіць, сябравалі сем`ямі. Іхнія мужы таксама працавалі разам у будаўнічай брыгадзе. Словам, жылі дружней, чым іншая радня.

Спачатку кабеты накіраваліся купляць кофтачку, бо Галі надта ж не цярпелася. Яна прымярала, круцілася перад люстэркам і сяброўкай, радасна пытала:

— Ну, што скажаш? Грошы-то немалыя, але і тавар добры.

— Бяры, што тут казаць. Якраз твой памер, і да твару вельмі пасуе. Толькі каб твой Антось не пярэчыў.

— Яшчэ чаго! Ён рад, калі я прыбіраюся.

— А мой Віктар то не. Раўнівы вельмі, іншы раз аж праціўна.

— Значыць, любіць, — суцешыла.

Галя расплацілася за кофтачку, і яны накіраваліся ў аддзел харчовых тавараў. Купілі што трэба і, весела гамонячы, пайшлі дадому, бо там была процьма розных гаспадарчых спраў.

Люба дастала пакупкі, а сумку павесіла на кручок у прыхожай. Павесіла і забыла. І толькі назаўтра раніцай, калі Віктар збіраўся на работу і папытаў дробных грошай на папяросы, кабета палезла ў сумку па кашалёк. Яго там не было.

— Ты так не жартуй, — зніякавела. — Забраў кашалёк ды яшчэ ў мяне грошай пытаеш.

— Ты што?! Кашалька я не браў, якія тут могуць быць жарты.

— Грошы прапалі! — Люба як стаяла, так у знямозе і апусцілася на табурэтку.

— Што значыць — прапалі? Паклала ў іншым месцы. Трэба шукаць.

— Ніякага іншага месца быць не можа! Як прыйшла з магазіна, сумку павесіла вось тут, кашалька з яе не даставала...

— Успамінай, усё ўспамінай па парадку! Дзе была, з кім, што купляла? Думай сваёй дзіравай галавой!

Думкі тыя, так бы мовіць, не змяшчаліся ў галаве. Ужо ўдваіх разважалі так і гэтак і ўрэшце рэшт прыйшлі да высновы: або кашалёк яна згубіла ў магазіне, або яго ўкрала Галя. Іншага варыянту не было.

Абое кінуліся да магазіна і падбеглі тады, як прадаўшчыца Ванда адмыкала дзверы.

— Што гэта вы такія ўтрапёныя? — пацікавілася.

— Вандачка, я, мабыць, учора ў магазіне кашалёк згубіла, — ледзь не плакала Люба. — Памятаеш, мы былі разам з Галяй? Я купіла масла, цукерак, хлеба. Разлічылася. Яшчэ пачакала, пакуль ты Галі адпусціш тавар, і мы пайшлі дадому. А сёння выявілася, што прапаў мой кашалёк. Можа, хто знайшоў ды табе аддаў? А можа, сама заўважыла? Там жа зарплата за цэлы месяц!

— Не ведаю... — няўцямна паціснула плячамі Ванда. — Ніхто мне яго не аддаваў, ды і сама не бачыла. Ідзіце глядзіце самі.

Глядзі не глядзі, а кашалёк прапаў з канцамі.

— Мне трэба на работу, а ты ідзі да ўчастковага, — параіў муж. — Скажы, што падазраеш суседку. Яна сабе абноўку купіла, грошы растраціла, а тваё ўкрала.

Дружба паміж сем`ямі дала такую трэшчыну, што і параўнаць не было з чым. Атрымаўшы заяву аб кражы, інакш пацярпелая гэта і не называла, участковы Макар Давідоўскі пайшоў з пытаннямі да Галі.

— Ніякага кашалька я не брала! — ледзь не галасіла кабета. — Хіба ведаю, дзе падзеўся?! Ну мы разам былі ў магазіне, куплялі тавары. І дадому разам ішлі. Усё гэта праўда, але пра кашалёк я не ведаю!

Вечарам, даведаўшыся ад Макара, што пошукі не далі ніякага толку, Люба пабегла да суседзяў.

— Зладзейка! — накінулася яна з парога на бедную Галю. — Авечкай нявіннай прыкідваешся!

— Не гняві Бога! Ты што, за руку мяне злавіла?!

— Каб злавіла, то размова была б інакшая. Ты ўсё хітра зрабіла, камар носа не падточыць!

— Вон з хаты! Зараз памыямі абалью!

Люба з Галяй, сустрэўшыся на вуліцы, адварочваліся, не віталіся. А на ферме сварыліся без усякай прычыны, абзывалі адна другую брыдкімі словамі. Жанчыны-даяркі хацелі іх памірыць, толькі ўсё гэта было марна.

Антось і Віктар таксама сталі ворагамі.

— Калі не аддасць твая баба кашалёк, то я сам знайду на яе ўправу! — прыгразіў Віктар. — Душу вытрасу разам з крадзеным.

— Ты спачатку дакажы, што яна вінавата, а потым пагражай!

Аграгарадок быў вялікі, і амаль у кожнай хаце абмяркоўвалі, так бы мовіць, факт крадзяжу. Адны заступаліся за Галю, другія — за Любу, але толкам ніхто нічога не ведаў.

З міліцыі далі адказ, што факт крадзяжу не ўстаноўлены.

— Сама, разява, недзе запраторыла, а людзей буйнуе, — казала ў магазіне Макарава жонка Наташа. — Яшчэ і майго абвінавачвае.

Мінаў час, варожасць расла. У маі, калі пасадзілі агароды, Любіна парася прашчамілася праз плот і парыла Галіну граду, дзе былі пасеяны буракі. Загнаўшы парася ў куток свайго плота, разлляваная, Галя мачыкай з усяе сілы стукнула яго па галаве. Тое падрыгала нагамі і заціхла. Кабета ўзяла і перакінула на суседскі ўчастак.

— Гэй, ідзі свежаніну смаж! — крыкнула Любе, якая нешта корпалася на надворку.

Праз некалькі дзён здох Галін певень і тры курыцы-нясушкі.

— Пабачыце, бабы, надыдзе такі час, што яны і біцца пачнуць, — насілася па вёсцы са сваімі разважаннямі пляткарка Зіна Кулька. Без яе ў вёсцы не абыходзілася ні адна, нават нязначная падзея, а тут такое! — Могуць пазабіваць адно другога, вось пабачыце!

— Ты лепш глядзі, што ў цябе ў хаце робіцца, — не любіла такой балбатні Стася Заблоцкая. — Падлога, нябось, ад Вялікадня не мыта, а ты ўсё чужыя справы разбіраеш.

— Як захачу! Учора Віктар сам казаў, што калі міліцыя зладзейцы рады не дала, то ён ведае, як ёй адпомсціць.

Усе домыслы абмяркоўваліся ў магазіне, куды пастаянна прыходзілі сяльчане. Прадаўшчыцы Вандзе так надакучыла гэта пустая балбатня, што яна часта выганяла баб з памяшкання.

— Купілі што трэба ды ідзіце, не перашкаджайце мне працаваць. От жа шчаслівыя людзі! Няма сваіх клопатаў, то чужымі душу вярэдзяць. У мяне вось рэвізія неўзабаве будзе, санстанцыя маецца на наступным тыдні прыехаць. Тут не ведаеш, за што брацца, а ім абы плявузгаць!

Пра санстанцыю ёй паведаміла знаёмая з райцэнтра, і Ванда тэрмінова выклікала з дому прыбіральшчыцу Анфісу Крупік, у якой быў выхадны.

— Мый і шаруй, Сяргееўна, так, каб усё блішчэла, а не — штраф будзеш плаціць сама, калі што якое.

Анфіса і сапраўды залезла ў кожную шчылінку. Адцягнула адну палавіну прылаўка і раптам пачула, як нешта ляпнула на падлогу.

Гэта быў чорны кашалёк.

— Глядзі, Казіміраўна! — паказала Вандзе. — Зашчаміўся і ляжаў паміж прылаўкаў, а цяпер выпстрыкнуў. Дурні пеўрагрызліся да знямогі, а кашалёчак тут, цэленькі...



МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

ВАДЗІЦЕЛЬ АЎТАЛАЎКІ ДЛЯ ВЯСКОЎЦАЎ АМАЛЬ СВАЯК


Міхаіл Фіяс

Больш за сорак гадоў працуе вадзіцелем грузавых аўтамашын Міхаіл Фіяс з Дзятлава. Два апошнія дзесяцігоддзі Міхаіл Мікалаевіч працуе на аўталаўцы, дастаўляе сельскім жыхарам прадукты.

У любы час года, у любое надвор`е людзі ў самых аддаленых вёсках упэўнены, што аўталаўка абавязкова да іх прыедзе. Інакш і быць не можа. А добразычлівы і ветлівы вадзіцель абавязкова раскажа што-небудзь цікавае, парадуе вясёлай гісторыяй.

Людзі лічаць Міхаіла Мікалаевіча амаль што сваяком, вельмі любяць і паважаюць яго. І ўдзячны яму да глыбіні душы.

ФОТА АЎТАРА

Язэп ПАЛУБЯТКА
Уласны карэспандэнт «ГС» у Мастах
Адрас: 231600, праспект Юнацтва, 12/21
Email: jazep.2004@tyt.by
Тэл: +37529 126-46-92



25 траўня 2016 года №22 (990)

НАВІНЫ

СЫХОД УСЁ Ж АДБЫЎСЯ

Днямі пакінуў пасаду намесніка старшыні Мастоўскага райвыканкама па пытаннях развіцця сацыяльнай сферы Аляксандр Яраш.

На пачатку гэтага года Следчы камітэт РБ абвясціў аб узбуджэнні крымінальнай справы супраць шэрагу кіраўнікоў Мастоўскага раёна па факце перавышэння імі службовых паўнамоцтваў. Папярэдне сваю пасаду пакінуў кіраўнік мясцовай ЖКГ Сяргей Фралоў. Другі фігурант гэтай справы — старшыня райвыканкама Аляксей Шафарэвіч таксама вымушаны быў сысці. Трэці — Аляксандр Яраш — працягваў працаваць да апошняга часу, але нядаўна пакінуў сваю пасаду і з`ехаў на працу ў Гродна, хоць на сайце райвыканкама ён значыцца яшчэ як намеснік.

У сувязі з заўчаснай смерцю Аляксея Шафарэвіча прадказаць вынікі следства зараз немагчыма.

ХТО ПАЕДЗЕ НА ЎСЕНАРОДНЫ СХОД

Нядаўна ў Мастах адбыўся раённы сход упаўнаважаных па вылучэнні кандыдатур і выбранні дэлегатаў на V Усебеларускі народны сход.

З 12 абраных толькі два чалавекі рабочых прафесій: Таццяна Траян, жывёлавод СПК «Азяранскі», і Васіль Туравец, вадзіцель ЖКГ. Усе астатнія — людзі пры пасадах.

Акрамя таго, у мастоўскую дэлегацыю была абрана прадстаўніца Гродна Эліна Брагіна, якая выконвае абавязкі першага сакратара Гродзенскага абкама БРСМ.

ВЕСЛАВАННЕ

АЛЕГ ЮРЭНЯ ВЫСТУПІЎ У ДУЙСБУРГУ


ФОТА WWW.KAYAK-CANOE.RU

На дыстанцыі — Алег Юрэня (на пярэднім плане)

З 20 да 22 траўня ў Дуйсбургу (Германія) праходзіў чарговы этап Кубка свету па веславанні на байдарках і каноэ. У складзе зборнай Беларусі выступіў Алег Юрэня, які пачынаў сваю спартыўную кар`еру ў Мастах, а зараз трэніруецца і жыве ў Брэсце.

Алег выступаў не на сваёй кароннай дыстанцыі 5 000 м, і, магчыма, таму вынікі сціплыя. Ён заняў восьмае места на байдарцы-адзіночцы на дыстанцыі 1000 м, быў трэцім у экіпажы байдаркі-чацвёркі і 18-м у заездзе байдарак-двоек на гэтай жа дыстанцыі. Гэтыя спаборніцтвы з`яўляюцца аднымі з асноўных этапаў падрыхтоўкі да сёлетніх Алімпійскіх гульняў у Бразіліі.

КАМУНАЛКА

ЦЯЧЭ? НЯХАЙ ЦЯЧЭ

У падвале дома №48 на вуліцы Савецкай з`явілая вада. Дзясятак жыхароў не могуць патрапіць у свае падвалы, не ступіўшы ў ваду.

Яшчэ напрыканцы лютага заяўку пра аварыйную сітуацыю падаў дыспетчару камунальнай службы жыхар дома Віктар Вангул. Заяўка была прынята, але аварыя не ліквідавана. Тады Віктар Сцяпанавіч па гэтым пытанні звярнуўся асабіста да начальніка ўчастка ЖКГ Сяргея Нарынкевіча. На зварот апошні адказаў: «Цячэ вада — дый няхай цячэ».

І да сённяшняга дня жыхары ходзяць па лужыне, каб трапіць у свае падвалы.

ФОТА АЎТАРА


Вось так і ходзяць у падвал

ЦІ КУБЫ ПРЫПІСВАЮЦЬ, ЦІ НЕІСНУЮЧЫ ТРАКТАР

Нядаўна сайт masty.eu абмяркоўваў зварот у рэдакцыю мастаўлянкі, дзе яна сцвярджае, што газавікі выстаўляюць невытлумачальныя рахункі, хоць за газ плаціцца поўнасцю і своечасова: раз у год прыходзяць рахункі з вялізнымі сумамі, як быццам бы раней аплачаныя кубы не ўлічваліся.



Даследаваць гэты факт — справа складаная, і зрабіць тое можа спецыяліст. Аднак што газавікі нешта ўсё ж дапісваюць — дакументальны факт.

Да карэспандэнта «ГС» звярнуўся чытач Станіслаў Бокіш, які пражывае па праспекце Міру, 10А, і паказаў акт выкананых работ на поўнае тэхнічнае абслугоўванне ўнутраных газаправодаў і газавага абсталявання. У акце распісана па пазіцыях, што правяралася падчас праверкі і кошт работ. Акрамя таго, выстаўлены рахунак за эксплуатацыю аўтамабіля, які даставіў спецыяліста да дома. З гэтай аплатай можна пагадзіцца. Акрамя платы за машыну, у акце выстаўлена плата за карыстанне трактарам. Было апытана каля дзясятка жыхароў дома, але ў той дзень ніхто з іх ніякага трактара ля дома не бачыў. Ды якія матывы, каб падчас звычайнага абходу кватэр гнаць яго да дома і дзеля чаго?

Плата за трактар нязначная — паўтысячы рублёў, але калі ў тысячы актах прыпісаць трактар, то можа набегчы пэўная сума. Карыстальнікаў газу ў горадзе не адна тысяча.

ЗДАРЭННІ

АТРУЦІЎСЯ САЛАМ

Так мяркуюць медыкі пра захворванне чалавека, за жыццё якога змагаліся 13 дзён.


ФОТА SLAVBAZAR.ORG

Пасля ўжывання кансерваванага сала, згатаванага ў хатніх умовах, чалавек занямог, але толькі на восьмы дзень звярнуўся ў лякарню. Медыкі ўстанавілі, што ён атруціўся таксінам батулізму сярэдняй ступені цяжкасці, і тэрмінова шпіталізавалі хворага. На папраўку ён пайшоў толькі на трынаццаты дзень знаходжання ў лякарні.

Як паведаміла Гродзенская радыётэлекампанія са спасылкай на спецыялістаў, меркаванне, што адзіная крыніцай батулізму з`яўляюцца грыбы хатняй кансервацыі, памылковае. Паводле звестак абласной службы гігіены і эпідэміялогіі, лідары сярод небяспечных для здароўя нарыхтовак у хатніх умовах — мясныя кансервы. Больш рэдкія, аднак не менш небяспечныя выпадкі атручвання агароднінай са слоікаў. Да прыкладу, агуркамі ці таматамі. У небяспечным шэрагу таксама салёнае сала і рыба. Як сцвярджаюць эксперты, гэта спіс прадуктаў, якія пасля кансервацыі ператвараюцца ў атруту, зусім неканчатковы.

СЫН СЛОНІМШЧЫНЫ МІХАЛ ВАЛОВІЧ

Студзень 1831 года. Пяцёра коннікаў ужо каторую гадзіну ў дарозе, пакінуўшы з важным заданнем сталіцу краю — Вільню. Наўкол варожыя патрулі, паўсюдна відаць перасоўванне расійскіх войскаў бліжэй да мяжы з Польскім Каралеўствам, дзе ў лістападзе мінулага года ўспыхнула паўстанне. Коннікі рухаюцца падалей ад чужых вачэй: дзе ляснымі сцежкамі, дзе заснежанымі палямі, па якіх жывёле асабліва цяжка. І вось каля Мерачы, нягледзячы на ўсе перасцярогі, яны натрапілі на заслон. Лютая пагоня да самага магутнага Бацькі-Нёмана, нават у такія маразы не закутага ў кайданы лёду. Прыціснутыя казацкім патрулём да ракі, пяцёра коннікаў апынуліся ў пастцы і павінны былі здацца. Але раптам іх кіраўнік рашучым рухам развярнуў каня ў бок ракі і прымусіў таго скокнуць з высокага берага ў сцюдзёную ваду, паказаўшы прыклад астатнім сваім сябрам.

Пяцёра коннікаў перабраліся на процілеглы бок Нёмана, пакінуўшы за сабой расійскіх казакоў. Тыя не адважыліся на далейшы пераслед атрада, які ўзначальваў Міхал Баловіч, ураджэнец маёнтка Парэчча на Слонімшчыне. Ён ехаў у Варшаву з просьбай дапамагчы зброяй для паўстанцаў на тэрыторыі былога Вялікага княства Літоўскага.

Валовічы на службе княству

Міхал Валовіч нарадзіўся 18 чэрвеня 1806 года ў Парэччах Слонімскага павету і паходзіў са знакамітага роду, вядомага з XV ст.

Першыя згадкі пра Валовічаў малююць іх як заступнікаў і апекуноў гарадзенскага Каложскага манастыра са старажытнай праваслаўнай Барысаглебскай царквой. Вяршынь дзяржаўнай лесвіцы дасягнулі пры вялікім князі Жыгімонце II Аўгусце, які ва ўмовах Лівонскай вайны з Масковіяй у 1569 годзе падпісаў унію аб утварэнні Рэчы Паспалітай — федэрацыі Вялікага княства Літоўскага і Кароны Польскай. На той час у ліку вышэйшых дзяржаўных асоб ВКЛ былі браты Рыгор і Астафій Багданавічы Валовічы, якія выступалі супраць заключэння дамовы з палякамі і імкнуліся захаваць незалежнасць краіны. Рыгор з'яўляўся слонімскім старастам *(староста — службовая асоба, якая кіравала адміністрацыйнай акругай і з'яўлялася намеснікам вялікага князя)* і падчас вайны ўзначальваў пасольства ў Маскву. Яго брат Астафій у 1579 годзе стаў канцлерам ВКЛ — другой пасля вялікага князя асобай у княстве. Ён адзін з распрацоўшчыкаў аграрнай рэформы 1557 года, вядомай як «Устава на валокі», арганізатар выдання II Статута ВКЛ 1566 года. Менавіта пад яго даглядам сумесна з яго намеснікам — падканцлерам ВКЛ Львом Сапегам, быў падрыхтаваны III Статут ВКЛ, які фактычна скасоўваў умовы Люблінскай уніі з Польшчай.


Маёнтак Парэчча

Шэраг уладанняў Валовічаў размяшчаліся на Слонімшчыне. Сярод іх вылучаўся маёнтак Парэчча на беразе Шчары. Менавіта тут у сярэдзіне XVII ст. віленскі харунжы Аляксандр Валовіч пабудаваў драўляны палац з разнастайнымі гаспадарчымі пабудовамі, у тым ліку малочнай фермай, рачной прыстанню, і разбіў вакол маёнтка ліпавы парк. Побач была ўзведзена драўляная царква для жыхароў ваколічных вёсак і фальваркаў, якімі валодаў род Валовічаў: Азарычы, Васілевічы, Задвор`е (Бартašы), Бабынічы, Камлявічы, Шундры, Навасёлкі, Наркаўшчына, Паўлавічы і Ферадкі.

Напярэдадні Трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай 1795 года і яе знікнення з палітычнай карты Еўропы маёнтак Парэчча атрымаў Казімір Валовіч, жанаты з прадстаўніцай вядомага інфлянцкага роду Фэлькерсамбаў — Мар`янай, ад якой меў траіх дзяцей: Міхала, Ганну і Паўліну. Казімір вылучаўся адукаванасцю, спрабаваў ва ўласных уладаннях уводзіць новыя формы кіравання. І нават шэрагу сялян дараваў волю, чым настроіў супраць сябе памешчыкаў-суседзяў, напалоханых перспектывай патрабавання таго ж самага ад прыналежных ім прыгонных сялян. Расчараваны агідным непаразуменнем з боку слонімскіх памешчыкаў, Казімір Валовіч шмат часу ўдзяляў замежным паездкам і дзейнасці ў масонскіх таемных таварыствах. Маёнтак жа здаваў арандатарам, якія выцягвалі з сялян усе сокі і ў выніку прыводзілі яшчэ да большай іх беднасці. Паступова ўладанні Валовіча скараціліся да межаў Парэчча з фальваркамі Яловікі і Гарадзішча.

Да эканамічных праблем дадаліся цяжкасці ў сямейных узаемаадносінах, вынікам чаго стаўся развод у 1816 годзе Казіміра Валовіча з жонкай Мар`янай, якая амаль адразу выйшла замуж за заможнага жыровіцкага памешчыка і ўладальніка маёнтка Стары Здзітаў у Пружанскім павеце Сцяпана Мікульскага. Старэйшая дачка Ганна да таго часу была замужам за маршалкам шляхты Ваўкавыскага павета Дамянікам Аскеркам. Малодшыя ж дзеці былі падзеленыя між бацькамі: Паўліна з`ехала разам з маці, а Міхал застаўся разам з бацькам у Парэччы.

Нягледзячы на ўсе цяжкасці, Казімір імкнуўся даць сыну самую лепшую адукацыю. Таму Міхал спачатку вучыўся ў Варшаве ў гімназіі, а ў 1822 годзе паступіў у Віленскі ўніверсітэт. Яго лепшым сябрам стаў Ігнат Дамейка — ураджэнец Навагрудчыны, будучы нацыянальны герой Чылі, вымушаны пакінуць Беларусь пасля паўстання 1830-1831 гг. Любімым жа настаўнікам Валовіча быў Іахім Лялевель, які чытаў ва ўніверсітэце курс гісторыі і з якім у далейшым у Міхала былі самыя цёплыя адносіны. Пасля заканчэння ўніверсітэта ў 1825 годзе Валовіч вяртаецца ў радавы маёнтак Парэчча, які ў 1826 годзе па дамове паміж бацькам і маці пераходзіць у яго ўласнасць, разам з вёскамі Парэчча, Задвор`е і Шундры. Казімір Валовіч пакідаў сабе фальваркі Ялавікі і Гарадзішча, а таксама вёскі Ніз, Паўлавічы і Ферадкі.


На малюнку — Міхал Валовіч і Лявон Працлаўскі

> **Перад выпраўленнем у дарогу Міхал, разумеючы ўсю небяспеку даручанай місіі, наведвае старога бацьку і нарачоную Касільду, шлюб з якой быў адкладзены з-за паўстання. Дзяўчына, вядомая сваёй прыгажосцю, пры расстанні сказала Міхалу: «Ідзі за сваім прызначэннем, душа мая пойдзе за табою. Ведаю, што яшчэ раз убачымся на зямлі, а потым ці тут, ці там, — паказваючы рукамі ўверх, — будзем злучаныя, бо што Бог злучыў, таго і смерць не раз`яднае».**

Паўстанцкі эмісар Міхал Валовіч

З пачаткам Лістападаўскага паўстання ў Польшчы, мэтаю якога абвяшчалася аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 года, у ВКЛ таксама распачалася падрыхтоўка да выступлення. Адным з самых актыўных з`яўляецца Слонімскі павет, дзе быў арганізаваны паўстанцкі камітэт на чале з шляхцічам Антонам Бронскім. Да яго далучаецца Міхал Валовіч, якога ў снежні накіроўваюць у Вільню па загады аб далейшых дзеяннях.

Перад выпраўленнем у Вільню Міхал, разумеючы ўсю небяспеку даручанай місіі, наведвае старога бацьку і нарачоную Касільду, шлюб з якой быў адкладзены з-за паўстання. Дзяўчына, вядомая сваёй прыгажосцю, пры расстанні сказала Міхалу: «Ідзі за сваім прызначэннем, душа мая пойдзе за табою. Ведаю, што яшчэ раз убачымся на зямлі, а потым ці тут, ці там, — паказваючы рукамі ўверх, — будзем злучаныя, бо што Бог злучыў, таго і смерць не раз`яднае». Міхал яшчэ раз заехаў дахаты ў Парэчча, дзе забраў прыхаваныя бацькам з напалеонаўскай вайны дубальтоўку, пару пісталетаў, і адправіўся ў дарогу.

У Вільні ён атрымаў заданне адправіцца ў Варшаву, каб дамагчыся дапамогі ад палякаў. І пасля сустрэчы з расійскім патрулём пад Мерачу ўсё ж здолеў патрапіць на аўдыенцыю да тагачаснага дыктатара Польшчы Хлапіцкага, але ў адказ толькі пачуў: «Я не маю для вас ані жмені пораху, ані аднаго карабіна, ані нават крэмню для стрэльбы; мне не галота, не апалчэнне, а рэгулярная армія патрэбна!» Міхал зразумеў, што ў такіх абставінах жыхары Беларусі і Літвы могуць разлічваць толькі на ўласныя мужнасць і сілу і што палякі не надта рады перспектыве пачатку паўстання на тэрыторыі былога княства, куды з усёй імперыі перакідваліся войскі, якія дасягнулі лічбы ў 125 тысяч салдат. Палякі маглі ім супрацьпаставіць толькі 55 тысяч чалавек.

Вяртацца на Радзіму з такімі навінамі Міхал не мог. Таму ў Варшаве ён уваходзіць у склад Літоўска-рускай лігі і ў лютым з палком уланаў удзельнічае ў Грахоўскай бітве, дзе атрымлівае сваю першую вайсковую ўзнагароду.

Васіль ГЕРАСІМЧЫК

ПРАЦЯГ У НАСТУПНЫМ НУМАРЫ

Афиша

27 мая. Футбол. Первенство Гродненской области по футболу среди 2005 г. р. 1-й тур. Стадион «Газпром трансгаз Беларусь». Начало в 11:00.

28 мая. Футбол. Чемпионат Гродненской области. «Слоним Сити» — «Белая Русь» (Дятлово). Стадион «Газпром трансгаз Беларусь». Начало в 14:00.

29 мая. Футбол. Чемпионат Беларуси. Первая лига. ФК «Слоним» — ФК «Гомель». Стадион «Юность». Начало в 17.00.

Егор ЖИГАЛИК

25 траўня 2016 года №22 (990)

ФУТБОЛ. ПЕРВАЯ ЛИГА

ВСЁ РЕШИЛОСЬ В КОНЦОВКЕ ВСТРЕЧИ

«ХИМИК» (СВЕТЛОГОРСК) — ФК «СЛОНИМ» — 2:1 (0:1)

Голы: 0:1 — Красий, 45; 1:1 — Затенко, 65; 2:1 — Белявский, 86.



Очередной тур в первой лиге для слонимчан не принёс очкового багажа. Футбольный клуб «Слоним» отправился в Светлогорск, где его экзаменовал местный «Химик».

Хозяева, до этой игры не знавшие вкуса победы, сумели в игре со слонимчанами одержать волевую викторию. В первой половине встречи гости выглядели предпочтительнее. На ударные позиции выходили Андрей Кухарёнок, дважды Владимир Шаков, Михаил Щербаков. Забить гостям посчастливилось на последней минуте первого тайма. После розыгрыша мяча с углового расторопнее других оказался Александр Красий — 0:1.

После перерыва команду как подменили: потерялось движение, стало много брака в передачах. Скрасить огрехи дважды с дальних дистанций сильными ударами пытался Андрей Кухарёнок, но на пути мяча вставал голкипер «Химика». Хозяева подсторожили ошибку гостей в развитии атаки и сумели отквитать один мяч, а после забитого мяча и вовсе перехватили игровую инициативу.

Под занавес встречи светлогорские футболисты забили второй мяч. Как оказалось, он стал для их команды победным.

Егор ЖИГАЛИК

И ПОКАЗАЛИ ОТЛИЧНЫЙ РЕЗУЛЬТАТ


Виктория Ольховик


Вероника Герасько

В Гродно с 17 по 19 мая проходила областная спартакиада школьников, на которой хорошие результаты показали юные слонимские тяжелоатлетки.

Вероника Герасько заняла 1-е место в категории 48 кг, Виктория Ольховик — 1-е место в категории 69 кг, Карина Косовец — 3-е место в категории 58 кг, Александра Изюмская — 3-е место в категории 63 кг.

Все они воспитанницы тренера Татьяны Бартош.

Никита ПАСТУХОВ

ФОТО ИЗ АРХИВА «ГС»

ФУТБОЛ. ПЕРВЕНСТВО ОБЛАСТИ

СЛОНИМЧАНЕ ВЫШЛИ В ФИНАЛЬНЫЙ ЭТАП

В Слониме в рамках областных соревнований «Олимпийские дни молодёжи» состоялся отборочный матч среди юношеских команд ДЮСШ №1 г. Слонима и ДЮСШ г. Новогрудка.

Игра прошла с завидным преимуществом хозяев и закончилась победой слонимчан со счётом 6:0.

Голевыми ударами отметились Александр Панов — 3, Вильгельм Берг — 2, Дмитрий Ремез.

В июне пройдут финальные состязания. Борьбу за звание сильнейшего поведут четыре команды Слонима, Щучина, гродненского «Белкарда» и Сморгони.

Егор ЖИГАЛИК

ФОТА АВТОРА


Юноши Слонима — среди сильнейших в области

ВАРИАНТ, ЧТО ШАКОВ СТАНЕТ ЛУЧШИМ БОМБАРДИРОМ ЛИГИ ЧЕМПИОНОВ, ВПОЛНЕ РЕАЛЕН

На электронную почту «Газеты Слонимской» написал человек, который занимается разработкой патча* для футбольного симулятора Pro evolution soccer 2016.

Он интересовался информацией о ФК «Слоним». Зовут его Павел Борисёнок. С ним связался корреспондент «ГС», и вот какой состоялся разговор.

— Павел, расскажите вкратце о себе. Чем Вы занимаетесь?

— Работаю в рекламном агентстве в Минске, занимаюсь продвижением в интернете.

— А чем для Вас является разработка патчей для футбольного симулятора Pro evolution soccer 2016?

— Это хобби, и я работаю над новой версией патча с белорусским чемпионатом для футбольного симулятора Pro evolution soccer 2016.

— И как давно делаете патчи для этой игры?

— Мое увлечение берет начало в 2006 году. Для меня как человека, который в футбол играет с шести лет, это пришлось по душе.

— А тяжело ли было найти информацию о ФК «Слоним»?

— С видео проблем нет, так как «Газета Слонимская» часто снимает футболистов и матчи с их участием. Поэтому найти их в интернете не проблема. А вот портреты игроков найти проблематично. Поэтому и написал письмо в «Газету Слонимскую». И каково было мое удивление, когда мне ответили в ВК и сбросили фото. Спасибо огромное газете!


— А реально ли с ФК «Слоним» выиграть Лигу чемпионов в игре?


— Думаю, что нет ничего невозможного. Если играешь хорошо, то все можно.

— Значит, и вариант, что в игре в нападении слонимской футбольной команды со временем будет играть Ибрагимович, в воротах Неймар, а Шаков станет лучшим бомбардиром Лиги чемпионов, вполне реален?

— Чтобы так случилось, должны и звезды сойтись, и уровень игры должен быть высокий. Конечно, все вполне реально.

Никита ПАСТУХОВ


Профиль вратаря ФК «Слоним» Артёма Гомелько


Новобранец ФК «Слоним» Тимофей Игруша


Павел Борисёнок

*Патч — это файл, который вносит дополнительную информацию в игру.



В КАКИХ ВОДОЕМАХ СЛОНИМА МОЖНО БУДЕТ КУПАТЬСЯ ЛЕТОМ, ЧИТАЙТЕ В СЛЕДУЮЩЕМ НОМЕРЕ «ГС»

25 траўня 2016 года №22 (990)

МИНЗДРАВ ПРИКАЖЕТ ДОЛГО ЖИТЬ?

Правительство Беларуси утвердило Государственную программу «Здоровье народа и демографическая безопасность Республики Беларусь» на 2016-2020 годы, сообщает БелТА.

Программа направлена на создание условий для улучшения здоровья населения, пропаганду здорового образа жизни, развитие и укрепление семейных ценностей, повышение престижа родительства, сокращение уровня смертности, увеличение ожидаемой продолжительности жизни. Предполагается повышение качества и доступности услуг системы здравоохранения, а также оптимизация внутренних миграционных процессов.

Программа включает семь подпрограмм: «Семья и детство», «Профилактика и контроль неинфекционных заболеваний», «Предупреждение и преодоление пьянства и алкоголизма», «Туберкулез», «Профилактика ВИЧ-инфекции», «Внешняя миграция», «Обеспечение функционирования системы здравоохранения Республики Беларусь».

За счет реализации мероприятий программы к 2020 году в Беларуси планируется увеличение ожидаемой продолжительности жизни до 74,6 года; снижение детской смертности в возрасте от 0 до 18 лет до 40,5 просантимилле на 100 000 человек; увеличение суммарного коэффициента рождаемости до 1,75; уменьшение распространенности потребления табака среди лиц в возрасте от 16 лет до 24,5 процента.

Предполагается увеличение физической активности взрослого населения до 40 процентов; снижение коэффициента смертности трудоспособного населения до 3,8 промилле на 1000 человек; снижение потребления алкоголя на душу населения; уменьшение заболеваемости населения туберкулезом.



Заказчиком-координатором программы выступает Министерство здравоохранения. Финансовое обеспечение госпрограммы будет осуществляться за счет средств республиканского и местных бюджетов, иных источников, не запрещенных законодательством, с ежегодным уточнением объемов финансирования при формировании республиканского и местных бюджетов на очередной финансовый год.

Всего на реализацию государственной программы в ближайшие пять лет планируется направить 274,7 трлн. рублей, в том числе средства республиканского бюджета составят 58,5 трлн. рублей, из них средства государственных целевых бюджетных фондов (превентивных фондов) — 743 млрд. рублей. Из местных бюджетов предполагается направить 201,27 трлн. рублей. Собственные средства организаций составят 14,5 трлн. рублей, иные источники — 412 млрд. рублей.

ООН СРАВНИЛА ПРОДОЛЖИТЕЛЬНОСТЬ ЖИЗНИ В МИРЕ, В ТОМ ЧИСЛЕ И В БЕЛАРУСИ

С 2000 по 2015 год среднемировой показатель ожидаемой продолжительности жизни возрос на пять лет.

Однако в мире сохраняется огромный разрыв в этих показателях между богатыми и бедными странами. Так, в Японии ожидаемая продолжительность жизни женщин — 86,8 лет, а в Сьерра-Леоне — 50 лет.

Об этом говорится в новом докладе Всемирной организации здравоохранения (ВОЗ) «Мировая статистика здравоохранения: мониторинг показателей здоровья в связи с Целями устойчивого развития», сообщает Центр новостей ООН.

«Мир добился больших успехов в сокращении числа случаев страданий и преждевременной смерти, вызванных болезнями, которые поддаются профилактике и лечению", — заявила Генеральный директор ВОЗ Маргарет Чань.

Согласно докладу, в период с 2000 года по 2015 год ожидаемая продолжительность жизни увеличилась на пять лет. Это самые высокие темпы роста с 1960-х годов. По мнению авторов доклада, такие достижения могут кардинально изменить ситуацию, преодолеть спад, который произошел в 1990-е годы, когда показатели ожидаемой продолжительности жизни снизились в Африке в результате эпидемии СПИДа и в Восточной Европе — вслед за распадом Советского Союза.

В последние годы самого заметного прогресса удалось добиться на африканском континенте, где ожидаемая продолжительность жизни увеличилась на 9,4 года и достигла в среднем 60 лет. Этому способствовали успехи в области борьбы с малярией, а также расширение доступа к антиретровирусной терапии для лечения ВИЧ-инфекции.

В докладе сообщается, что в России продолжительность жизни женщин составляет 76,3 года, мужчин — 64,7 года, на Украине — 76,1 и 66,3 лет, соответственно. В Беларуси в среднем женщины могут прожить 78 лет, а мужчины 66. В Азербайджане ожидаемая продолжительность жизни мужчин — 69,6 года, а женщин — почти 76 лет.

Средняя мировая ожидаемая продолжительность жизни людей, родившихся в 2015 году, во всем мире составила 71,4 года. Девочка, рожденная в 2015 году, может прожить 73,8 лет, мальчик — около 69,1. Однако будущее каждого конкретного ребенка зависит от места его рождения. В докладе сообщается, что средняя ожидаемая продолжительность жизни новорожденных детей в 29 странах с высоким уровнем дохода составляет 80 лет или более, в то время как для 22 стран, расположенных в Африке к югу от Сахары, этот показатель — ниже 60 лет.

Самая высокая средняя продолжительность жизни женщин — 86,8 лет — в Японии. Самая высокая средняя продолжительность жизни мужчин — 81,3 года — в Швейцарии. Самые низкие в мире показатели продолжительности жизни для обоих полов зарегистрированы в Сьерра-Леоне — 50,8 лет у женщин и 49,3 года у мужчин.

thinktanks.by

СЛОНИМСКИЕ ТОРГОВЫЕ ОБЪЕКТЫ ПРОДОЛЖАЮТ НАРУШАТЬ САНИТАРНЫЕ НОРМЫ

Слонимский зональный центр гигиены и эпидемиологии в очередной раз напоминает, что при покупке продуктов в торговых объектах необходимо быть предельно внимательными.

Только в апреле 2016 года при проведении надзорных мероприятий за торговыми объектами специалисты санслужбы выявили нарушения требований санитарных норм и правил в 32 объектах.

Из обращения изъято 65,15 кг недоброкачественной продукции, из которых:

— с истекшим сроком годности — 28,49 кг (6 случаев);

— без маркировочных ярлыков и с неполной информацией на ярлыках — 9,264 кг (4 случая);

— несоблюдение установленных температурных режимов и условий хранения пищевых продуктов — 4,8 кг (1 случай);

— без документов, удостоверяющих качество и безопасность — 21 кг (1 случай).

По фактам выявленных нарушений составлено 11 протоколов об административном правонарушении: на должностных лиц наложены штрафы на сумму 9 660 000 руб.

К административной ответственности в виде штрафов привлечено три юридических лица, допустивших нарушения санитарно-эпидемиологического законодательства, в числе которых Слонимский филиал Гродненского ОПО, ОАО «Слонимский мясокомбинат», РУПС «БелПочта», на сумму 19 950 000 руб.

Государственный санитарный надзор за торговыми объектами продолжается.

Страницу подготовила Анна ВОЛОДАЩУК


Апытанне

У пятніцу і суботу ў Слоніме прайшлі імпрэзы — “Жыровіцкі фэст”, “Паланэз-2016”, “Ноч музеяў”. Ці наведвалі Вы якое-небудзь з гэтых мерапрыемстваў і ці спадабалася яно Вам? — такое апытанне правяла “ГС” у сацсетках, “Аднакласніках” і “УКантакце”. Вынікі апытання на 24.05 такія (на 9:20 прагаласавала 86 чалавек):

Быў, спадабалася — 19
Было так сабе — 10
Не наведваў і не шкадую — 32
Не наведваў, але хацелася б схадзіць — 25.


25 траўня 2016 года №22 (990)

АЛФАВИТНЫЙ КРОССВОРД



ОТ ВЛАДИМИРА ВАШУТЫ

фраза-ПАРОЛЬ



ВСЕ ЗАГАДАННЫЕ СЛОВА В ЭТОМ КРОССВОРДЕ НАЧИНАЮТСЯ С БУКВЫ “М”

1. Жанр западноевропейской средневековой религиозно-назидательной стихотворной драмы.
2. Мелодия, напев.
3. Однолетнее кормовое растение.
4. Кварц, слюда.
5. Наука о грибах.
6. Город в Колумбии.
7. Воинское звание.
8. Уменьшенная модель предмета.
9. Тонкая хлопчатобумажная ткань.
10. Руководитель русского народного ополчения 1611-1612 годов.
11. Киргизский национальный эпос.
12. Исключительное право на производство или продажу чего-нибудь.
13. Замороженное сладкое кушанье из сливок, сахара, сока, ягод.
14. Лад, спокойствие.
15. Специалист по минералогии.
16. Молочный автомобиль.
17. Футбол на мотоциклах.
18. Российский эстрадный певец.
19. Травянистое растение с ядовитым млечным соком.
20. Порода овец.
21. Боевой корабль с малой осадкой.
22. Сильный холод.
23. Мгновение.
24. Расточитель.
25. Кусочек мела для рисования.
26. Город-герой.
27. Двигатель.
28. Мотоцикл педальный.
29. Город в Ираке.
30. Музыкальный лад светлой, радостной окраски.
31. Русский конструктор стрелкового оружия.
32. Страстный любитель музыки.
33. Американская киноактриса, исполнительница главной роли в фильме «В джазе только девушки».
34. Греческий остров.
35. Летчик-испытатель, Герой Советского Союза.
36. Южноамериканский ударный музыкальный инструмент, погремушка.
37. Город в Турции.
38. Российский эстрадный певец.
39. Итальянский футбольный клуб.
40. Город в Австралии.
41. Способ теоретического исследования или практического осуществления чего-нибудь.
42. Город на реке Васюган.
43. Специалист по математике.
44. Русский живописец-передвижник.

Разгадай сканворд и выиграй пиццу!

Ответы на кроссворд — SMS-сообщения с разгаданным словом-паролем — принимаются на номер **8 029 133-04-21 до 20 часов 29 мая.**

Победителем станет наш читатель, чьё SMS-сообщение с правильным ответом придет 10-м по счету! В случае если ответов будет меньше десяти, пиццу получит участник, приславший ответ последним (до указанного времени). С одного номера принимается только одно сообщение.

В прошлый раз было прислано 29 ответов.

НАШИ ПОБЕДИТЕЛИ

Победителем прошлого конкурса стал наш читатель с номером +375 44 51xxx54


Дмитрий Кашко

Рэтрафота




Слонім, помнік-танк, год невядомы

ФОТА VK.COM/MOISLONIM

РАСШЫФРУЙ КОД «ГС»

Удзельнік конкурсу, які да 20 гадзін **29 траўня** адправіць SMS-паведамленне з правільным адказам — назвай матэрыялу, дзе прысутнічае такая фраза:

...душу вярэдзяць...



на нумар **8 029 133-04-21** і гэтае паведамленне будзе **3-м** па ліку, атрымае ў падарунак адкрывалку-падвеску для ключоў.


Пераможцам пазамінулага конкурсу стала Хрысціна Кананові́ч.

У мінулы раз правільных адказаў не было.

Лепшы адпачынак — з “Газетай Слонімскай”!

Старонку падрыхтавала Жанна ІВАНОВА





Поёт группа «Шлягер»: Татьяна Григорчик, Ксения Васильева, Алеся Адамчик, Алина Жилинская

КОЛЛЕКТИВЫ СШ №8 ПОДТВЕРЖДАЛИ СТАТУС

На прошлой неделе образцовые коллективы СШ №8 подтверждали свое звание.

Комиссия профессионалов из Гродно приехала в учебное учреждение, чтобы посмотреть подготовленные программы. Свои образцовые звания подтверждал хор «Званочак» (руководитель Марина Володкович), оркестр народных инструментов (руководитель Татьяна Цвикевич) и студия «Шанс» (руководитель Елена Фомченко).

Творческие коллективы средней школы №8 знамениты своими номерами не только в Слониме, но и на республиканском уровне. Глядя на концерт, который показали ребята и их руководители, в очередной раз убеждаешься: они носят звание образцовых коллективов не просто так.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ФОТО АВТОРА



Играет Анна Фидрик



На сцене солисты Полина Крамник и Стас Грасевич

ЁЖИК

К нам в редакцию пришло письмо:

— Добрый день, «Газета Слонимская»! Я Влад Тихончук, мне десять лет. Написал рассказ и высылаю вам. Если мой рассказ понравится, то напечатайте его.

Рассказ Влада мы печатаем на страничке для детей «Праменьчык».



РИСУНОК ЕВГЕНИЯ ИВАНОВА

Было это или не было, но, говорят, жил когда-то большой Ёж и маленький Ёжик. Они жили в большом лесу. У них был свой домик, а в нём было всегда уютно и тепло. Папа Ёж своему сыну рассказывал много интересных историй и учил нехитрым навыкам. Большой Ёж учил любить каждый цветок, каждый кустик. Учил собирать грибы, сухие листья, а также охотиться на мышей. Маленький Ёж не хотел трудиться, а только гулял.

Однажды маленький Ёж побежал по лесу и увидел серебряную дорожку.

— Ой, какая красивая дорога! Я побегу по ней! — и побежал.

— Куда ты бежишь, Ёжик? Знаешь ли ты, куда ведёт эта дорога? — спросил Зайка.

— Красивая дорожка приведёт меня в красивое место.

— Откуда ты знаешь, что она красивая?

— А разве ты не видишь, как она блестит?

— Блестит, и что из этого?

Но Ёжик уже не слышал Зайку, а бежал вперёд по дорожке. Бежал он, бежал, пока серебряная дорога не привела его под балкон большого дома, а затем в сырой тёмный подвал.

— Ой, где же я это очутился и где мой дом?

Он весь задрожал от страха. Ёжик обернулся, но серебряной дороги не было. А ещё ему было очень холодно. Шли минуты, часы. Ёжик сопел и хотел домой. Вдруг послышалось звонкое «Ку-ка-ре-ку!» Это пропел петух. Затем открылась дверь и в подвал кто-то вошёл. Маленького Ёжика взяли на руки и принесли в дом. Ему налили молока, но Ёж боялся и ничего не ел. Так он прожил в доме два дня, а потом его отнесли в лес.

Папа Ёж бросил все дела и искал сына. Через некоторое время они встретились. И отец Ёж пояснил малышу, что не всегда ухоженная, серебряная дорога ведет в хорошее место. С того времени Ежик слушает старших и во всём им помогает.

Автор рассказа
Влад ТИХОНЧУК, 10 лет

Старонку падрыхтавала Таццяна ПЛАХЕТКА

tanyaplahetko@gmail.com, ТЭЛ. 8-029-783-13-99

Намеснік галоўнага рэдактара
Мікола КАНАНОВІЧ
Журналісты
Мікіта ПАСТУХОЎ
Яўген ВАЛАДАШЧУК
Таццяна ДЗЕНІСЮК
Алена КАСЦЮК
Стыль-рэдактар
Жанна ПЛЕШКО
Рэдакцыя сайта www.gs.by
Рэдактар
Дзмітрый МІЦКЕВІЧ
Спецыяліст па рэкламе
Наталля ЦАРОВА

Галоўны бухгалтар
Ганна ВАРАНОВІЧ
Бухгалтар
Вольга БУРСЕВІЧ
Аддзел падпіскі і продажу
Аляксей НАВІЦКІ
8-(029) 322-06-42
Вёрстка і дызайн
Віталь ЕМЯЛЬЯНАЎ
Сяргей РЭКУН

Тэлефоны рэдакцыі:
т/факс: **8 (01562) 29-999,**
Тэл. 6-36-58, 6-36-68, 6-36-54, 6-36-44.
Velcom: **8-029-133-04-21**
Skype — gazslon
(9.00-18.00)

Для карэспандэнцыі:
231799, г. Слонім,
вул. Чырвонаармейская, д. 41
e-mail: gs@gs.by,
gazslon@gmail.com

Рэкламная служба
Начальнік рэкламнай службы
Ганна ВАЛАДАШЧУК
anna@gs.by
8-(029) 612-26-43
Супрацоўнікі
Наталля СТРУПАВЕЦ
Людміла КАМЯНЕЦКАЯ
8-(044) 715-90-03
8-(01562) 6-60-56
(9.00–16.00)
т/факс:
8-(01562) 29-000

Прыём аб'яў і падпіска:
г. Слонім, Чырвонаармейская, 73 Б
(будынак АРЗ)
Працуем аўторак — пятніца 8^{00}-17^{00}
субота — нядзеля 9^{00}-15^{00}
выхадны — панядзелак
8-(044) 762-48-39



«Давай познакомимся»

Хотите встретить свою вторую половинку, но у вас это не получается? «ГС» поможет вам найти друг друга.

Давайте объявление, приносите свои фото с кратким рассказом о себе по адресу: г. Слоним, ул. Красноармейская, 73 Б, тел. для справок 6-60-56, 8-044-762-48-39.

24 «ГС» + 16 «Отдушины» = 40 стар.
25 траўня 2016 года №22 (990)



погода на неделю

	утро	день	вечер
СРЕДА, **25 мая**	12⁰	20⁰	20⁰
ЧЕТВЕРГ, **26 мая**	11⁰	25⁰	23⁰
ПЯТНИЦА, **27 мая**	14⁰	24⁰	23⁰
СУББОТА, **28 мая**	15⁰	24⁰	24⁰
ВОСКРЕСЕНЬЕ, **29 мая**	15⁰	22⁰	22⁰
ПОНЕДЕЛЬНИК, **30 мая**	16⁰	26⁰	26⁰
ВТОРНИК, **31 мая**	18⁰	29⁰	20⁰
СРЕДА, **1 июня**	25⁰	30⁰	21⁰

www.meteoprog.by



ОТ ВСЕГО СЕРДЦА

Уважаемые друзья!

«Газета Слонимская» открывает новую рубрику – «От всего сердца». В этой рубрике мы разместим видео- и аудиопоздравления вашим родным, близким, друзьям, коллегам по работе, учителю и начальнику с любым торжеством: днем рождения, юбилеем, свадьбой, рождением ребенка и т.д.

Мы разработаем для Вас оригинальный сценарий поздравления. А также Вы сами сможете прислать свой поздравительный видеоролик. Аудио- и видеопоздравление будет размещено на сайте «Газеты Слонимской», на главной странице, в нужный Вам день. Видеоролик с поздравлением по Вашему желанию может быть размещен и в социальных сетях «ГС»: «ВКонтакте», «Фейсбуке», «Одноклассниках», «Инстаграме». Тел. для справок: 29-000, 8-029-61-22-643. Как подать видеопоздравление, читайте на титульной странице сайта gs.by в рубрике «Поздравления»

ВИРТУАЛЬНОЕ ПОЗДРАВЛЕНИЕ — ОРИГИНАЛЬНЫЙ ПОДАРОК, КОТОРЫЙ ВАМ ЗАПОМНИТСЯ НАДОЛГО И ОСТАНЕТСЯ НА ВЕКА В ГЛОБАЛЬНОЙ СЕТИ!

ПАЗНАЙ МЕСЦА І АТРЫМАЙ ПІЦУ!

Сябры, калі вы пазналі пабудову на фотаздымку, шліце SMS-паведамленне з адказам на нумар 8 029 133-04-21. Неабходна ўказаць назву ці адрас пабудовы — вуліцу і нумар.

Што гэта Дзе гэта



УМОВЫ

➢Адказы прымаюцца **да 20 гадзін 29 траўня**.

➢Пераможцам конкурсу стане наш чытач, адказ якога прыйдзе на тэлефон **пятым па ліку**!

➢У выпадку, калі адказаў будзе менш чым пяць, уладальнікам піцы стане ўдзельнік, чыё SMS-паведамленне будзе апошнім.

➢З аднаго тэлефоннага нумара прымаецца адзін адказ.

Пераможцам мінулага конкурсу стаў наш чытач з нумарам +375 29 90ххх40. Было даслана 9 адказаў.

НАШЫ ПЕРАМОЖЦЫ



Ілля Фёдараў



Адказ на мінулае заданне: дом на вул. Першамайскай, 8

Жанна ІВАНОВА
ФОТА АЎТАРА

ПОСЛЕДНИЙ ДЕНЬ ПОДАЧИ РЕКЛАМЫ в «Газету Слонимскую» – **ВОСКРЕСЕНЬЕ ДО 15.00**

Дзякуй за тое, што выбралі “Газету Слонімскую”!

Галоўны рэдактар Віктар Уладзіміравіч Валадашчук, victor@gs.by

На сайт «ГС» можно зайти с помощью QR-кода с мобильного устройства



Заснавальнік **Віктар Уладзіміравіч ВАЛАДАШЧУК**

Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах

Рэгістрацыйнае пасведчанне №64 ад 05.03.2009 года. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Свидетельство о госрегистрации УП «Газета Слонимская» ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.

email: gs@gs.by, gazslon@gmail.com
Юрыдычны адрас: 231800, г.Слонім, вул. Чырвонаармейская, 41

Тыраж: 3 500

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (ільготная)

Свабодны кошт

Час падпісання да друку па графіку 24 траўня 2016 года 16:00.

Аб'ём — шэсць умоўных друкаваных аркушаў.

Надрукавана ў друкарні ГАУПП «Гродзенская друкарня» г. Гродна, вул. Паліграфістаў, 4, індэкс 230025.

Заказ № 2 644